Ці будзе Народны фронт удзельнічаць у рэферэндуме і давыбарах Вярхоўнага Савета? (стар. 2)
Мяснікові́ч хадзіў пераконваць КДБ (стар. 3)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік і выдавец Павел Жук
Наклад 46.400
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

1 кастрычніка 1996 г. | № 74 | Кошт свабодны

Савет Еўропы папярэджвае Лукашэнку

Як паведамляе агенцтва *Reuter*, у чацвер, 26 верасня, Савет Еўропы прыняў заяву, у якой прапанаваў прэзідэнту Беларусі А.Лукашэнку адкласці прызначаны на лістапад рэферэндум. *«Беларусь страціць шанцы на ўступленне ў Савет Еўропы, калі ўлады краіны не будуць прытрымлівацца дзеючай Канстытуцыі і прынцыпаў дэмакратыі»*, — цытуе *Reuter* заяву Савета Еўропы.

Парламент адключыўся ад тэлерадыёкампаніі

Цяпер дэпутатаў не абвінаваціш, нібыта яны імкнуцца «пакрасавацца» перад тэлекамерамі.

У мінулую пятніцу парламент пазбавіў журналістаў Белтэлерадыёкампаніі акрэдытацыі на сесіі Вярхоўнага Савета. Большая частка пастановы па гэтым пытанні ўяўляе сабой пералічэнне «грахоў» Беларускага тэлебачання за апошнія месяцы. Гэта і невыкананне рашэння ВС аб прамой трансляцыі падчас абмеркавання рэферэндуму, і ігнараванне пастановы аб арганізацыі штотыднёвай тэлеперадачы «Парламенцкі час», і непрадастаўленне магчымасцяў для выступлення кіраўніцтву ВС.

Парламент, улічваючы ўсё гэта, даручыў Генеральнаму пракурору *«ажыццявіць неабходныя меры пракурорскага рэагавання»*, а журналістаў тэлерадыёкампаніі пазбавілі акрэдытацыі ў парламенце *«за сістэматычнае неаб'ектыўнае, тэндэнцыйнае адлюстраванне пасяджанняў Вярхоўнага Савета»*.

Метады і стыль беларускага тэлебачання, вядома ж, не выклікаюць іншых пачуццяў, акрамя агіды, аднак і рашэнне ВС не стварае «пачуцця вялікага задавалнення». Пазбавіўшы Белтэлерадыёкампанію акрэдытацыі, парламент, акрамя ўсяго, прызнаў гэтым крокам сваю няздольнасць як-небудзь паўплываць на тэндэнцыйнасць БТ. Да таго ж ануляванне акрэдытацыі адбылося без выключэнняў — пад гарачую дэпутацкую руку патрапілі, напрыклад, і журналісты «Радыё-2», якія геральна запрашалі ў свой эфір і Шарэцкага, і Карпенку.

Аднак тое, што адбылося, безумоўна, мае і станоўчыя аспекты. Парламент гучна заявіў, што Беларускае «прэзідэнцкае» тэлебачанне распаўсюджвае дэзінфармацыю. Гэта павінна падштурхнуць пэўную, найбольш актыўную частку насельніцтва шукаць інфармацыю пра дзейнасць заканадаўчай улады з іншых крыніцаў.

Віталь ЦЫГАНКОЎ

Жыллёвая праграма ў бяздзеянні

Фінансаванне льготнага крэдытавання жыллёвага будаўніцтва за 8 месяцаў выканана менш чым на 0,1%.

Абяцанні льготных крэдытаў на будаўніцтва жылля ўсё часцей можна пачуць з вуснаў прэзідэнта А.Лукашэнкі. Апошняй катэгорыяй грамадзян, якіх ён узяўся ашчаслівіць «ільготамі», стала моладзь. Прэзідэнт запэўнівае людзей да 30 гадоў, што ў іх нарэшце з'явіцца магчымасць атрымаць крэдыт на пабудову свайго дома ці кватэры, прычым пад невялікі працэнт. Будучым домаўладальнікам засталося толькі падтрымаць А.Лукашэнку на рэферэндуме.

Між тым сённяшнія «дасягненні» у гэтай галіне сведчаць, што спадзявацца на ўладу не даводзіцца. Ва ўсякім разе, дагэтуль свае абяцанні яна не выконвала. Згодна з бюджэтам на 1996 год, на льготнае крэдытаванне жыллёвага будаўніцтва прадугледжваліся выдаткі ў памеры **497,2 млрд. рублёў.** Між тым, дадзеныя мінфіна сведчаць, што за першае паўгоддзе было патрачана на гэтыя мэты толькі **0,34 млрд.** (альбо менш за 0,1% ад прадугледжанай на год сумы). Цікавасць выклікае і тая акалічнасць, што за ліпень і жнівень гэтая лічба, па сутнасці, не змянілася, бо за гэты тэрмін грошы па гэтым артыкуле бюджэту амаль наогул перасталі выдзяляцца.

Алесь ПАЎЛОВІЧ

Антончыка затрымалі, але праз дзве гадзіны выпусцілі

Гэта здарылася ў мінулы чацвер каля мінскага стадыёна «Дынама».

Сяргея Антончыка затрымалі міліцыянты пасля таго, як ён выступіў на прафсаюзным сходзе, які праводзілі ў той дзень на стадыёне мінскія «чаўнакі». Выступаў ён літаральна паўтары хвіліны, коратка распавёўшы аб правах, якія мае прафсаюз.

«Калі я выйшаў за вароты стадыёна, — расказвае Антончык, — *мяне спыніў маёр міліцыі і запатрабаваў прайсці ў машыну «для размовы з кіраўніцтвам». Я паведаміў яму, што з'яўляюся дэпутатам Мінскага гарсавета і гатовы гаварыць з любым «кіраўніцтвам», але тут, на вуліцы. Тады другі афіцэр міліцыі (капітан) даў каманду схапіць мяне і некалькі сяржантаў пацягнулі мяне ў машыну. Завезлі ў пастарунак Ленінскага РАУС і трымалі там дзве гадзіны без усялякіх тлумачэнняў. Відаць, яны самі не ведалі, што рабіць са мной далей, таму ўвесь час некуды тэлефанавалі. Урэшце склалі пратакол, у якім напісалі, нібыта я заклікаў людзей да акцыяў непадпарадкаваня. Я напісаў, што ўсё гэта лухта і гэта могуць пацвердзіць усе ўдзельнікі сходу. Калі мяне выпусцілі, я адразу пайшоў у Пракуратуру РБ і напісаў заяву наконт гэтага незаконнага затрымання».*

А нам нічога не застаецца, як павіншаваць супрацоўнікаў Ленінскага РАУС з чарговым геройчным учынкам.

Мікола ГРЫНЯВІЦКІ

(Падрабязнасці пра сход «чаўнакоў» чатайце на стар. 3)

Смак цэнзуры

Вярнуўшыся з паездкі ў Савет Еўропы, шэф Дзяржкамдруку Уладзімір Бельскі паведаміў на прэс-канферэнцыі, што ягонае ведамства мае намер з дапамогаю суда забараніць некаторыя газеты.

Уладзімір Бельскі заявіў, што Дзяржкамдрук будзе кантраляваць прэсу, *«глядзець за тымі ці іншымі выданнямі, якія парушаюць законы і даваць ім папярэджанні. Пасля некалькіх папярэджанняў,* — заўважыў ён, — *мы перадаем справу ў суд, які вырашае далейшы лёс газеты. З аднаго боку можна бачыць, што мы наступаем на дэмакратыю, з іншага боку мы, як выканаўчая ўлада, абавязаныя гэта рабіць».* Атрымліваецца, што група чыноўнікаў фактычна бярэ на сябе ролю цэнзараў. Няцяжка сабе ўявіць, што здарыцца, калі яны адчуюць смак гэтай справы.

У газетным артыкуле адзін з прадстаўнікоў Дзяржкамдруку выказаўся, што *«інфармацыйная бяспека грамадства павінна быць не меншай, чым бяспека эканамічная ці ваенная»*.

Гаворачы пра свой візіт у Страсбург, старшыня Дзяржкамдруку прызнаўся, што *«ў Савеце Еўропы ён найбольш востра адчуў аплёўванне нашай краіны, усіх працэсаў, што ў нас адбываюцца, прадстаўленне сітуацыі ў нейкім няправільным выглядзе».* Асабліва перажывае старшыня Дзяржкамдруку, што «аплёўванне» адцягвае прыём Беларусі ў Савет Еўропы. Праўда, ён так і не патлумачыў, хто і ў каго плюе.

Бельскі таксама паскардзіўся, што семінар «СМІ у дэмакратычным грамадстве», які павінен быў адбыцца ў Мінску напрыканцы верасня, давялося перанесці на канец кастрычніка. А ўсё, маўляў, з-за таго, што Савет Еўропы, які фінансуе гэты семінар, пажадаў, каб да ўдзелу ў ім абавязкова прыцягнулі прадстаўнікоў шэрагу незалежных выданняў — толькі пры такой умове Страсбург гатовы даць грошы на правядзенне семінару. Аднак Бельскі чамусьці лічыць гэтую цалкам лагічную ўмову «зневажальнай». *«Чаму нас абавязваюць кагосьці запрашаць?* — здзіўляецца ён. — *Мы хочам запрашаць у першую чаргу дзяржаўныя выданні, тых, хто яшчэ не хлябнуў гэтай свабоды».* Дзіўна, што старшыня Дзяржкамдруку не разумее відавочную рэч: калі грошы плоціць Савет Еўропы, то ён мае права запрасіць на семінар не толькі Бельскага і кампанію.

Мікола ВАЙТОВІЧ

Ваенныя фантазіі ў чарнобыльскай зоне

Міністэрства абароны накіравала ў прэзідэнцкую адміністрацыю план вучэнняў у чарнобыльскай зоне. Вучоныя выступаюць супраць гэтага небяспечнага эксперыменту.

Ідэя зыходзіць непасрэдна ад Лукашэнкі. У час наведання Гомельскай вобласці прэзідэнт публічна заявіў, што загадае правесці ў чарнобыльскай зоне ваенныя вучэнні, каб знесці ўсе будынкі, якія тут засталіся. І вось цяпер прэзідэнцкая фантазія аказалася блізкай да ажыццяўлення. На тэрыторыі зоны плануецца спаліць (або ўзарваць) каля 6 тысяч пабудоваў.

Як паведамілі ў навукова-даследчым інстытуце радыяцыйнай бяспекі, у час спальвання радыяактыўнасць разносіцца на адлегласць да 30 — 40 кіламетраў. У час выбухаў радыянукліды падымуцца з зямлі ў паветра і разам з дымам і пылам будуць рассеяныя па навакольным асяроддзі. Дырэктар інстытута Васіль Несцярэнка сказаў карэспандэнту СВАБОДЫ, што *«ў гэтым мала карысці, а небяспека вельмі вялікая. Такі непрадуманы эксперымент можа прынесці вялікую бяду. Мы можам разнесці радыяактыўнасць на чыстыя тэрыторыі. Я ніколі не падпішуся пад такім эксперыментам і лічу яго неабгрунтаваным у навуковым плане. Я ніколі не пасылаў бы туды людзей»*, — адзначыў В.Несцярэнка.

Аднак вярхоўны галоўнакамандуючы ўжо даў загад і яго стараюцца выконваць. А вось да думкі навукоўцаў ніхто не прыслухоўваецца. Несцярэнка лічыць, што *«калі бачыш сваімі вачыма ступень небяспекі, тады можна прымаць рашэнне пра вучэнні. А не так, што спачатку правесці іх, а потым падганяць усю навуку пад тое, што яны бяспечныя. Так не робіцца»*.

На думку Васіля Несцярэнкі, *«зону трэба пакінуць у спакоі на дзесяткі гадоў, ахоўваць яе, каб туды не пранікалі людзі і не займаліся гаспадарчай дзейнасцю. Няхай прырода сама сябе аздараўляе. Гэта самы надзейны шлях. Тады людзі менш пацерпяць. Трэба ж думаць найперш пра чалавека»*.

Васіль Несцярэнка лічыць, што ад вучэнняў пацерпяць жыхары навакольных вёсак. *«Я ўжо не кажу пра салдат і іншых удзельнікаў вучэнняў. Цяпер у зоне ўсё спакойна, сарбіравана, але калі разгарыцца... Найвялікшыя дозы атрымаюць салдаты, якія будуць знішчаць дамы ў зоне»*, — падкрэсліў вучоны.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

В.Ціхіня: «Рана ці позна, але за парушэнні Канстытуцыі давядзецца адказваць»

На прэс-канферэнцыі ў мінулую пятніцу старшыня Канстытуцыйнага суда В.Ціхіня заявіў, што калі будзе прыняты прэзідэнцкі праект канстытуцыі, то Беларусь ператворыцца *«ў другое Гаіці ў цэнтры Еўропы»*.

Прэзідэнцкі праект асноўнага закона фактычна ўстанаўлівае дыктатуру аднойасобы з імператарскімі паўнамоцтвамі; грамадзяне не атрымліваюць ніякіх дадатковых правоў, а Лукашэнка бярэ сабе больш улады, чым нават мае прэзідэнт Расіі, лічыць Валерый Ціхіня.

Сённяшняя Канстытуцыя, перакананы старшыня КС, не перашкаджае Лукашэнку эфектыўна кіраваць дзяржавай, праводзіць эканамічныя рэформы. *«Пра канстытуцыйны крызіс сёння гавораць тыя, хто ігнаруе і парушае дзеючую Канстытуцыю,* — заявіў ён. — *Гэтыя людзі не жадаюць дабра свайму народу, як бы яны ў гэтым ні кляліся. Сваімі дзеяннямі яны разбураюць беларускую дзяржаўнасць, бо гібель дзяржавы пачынаецца з краху законаў».* Разам з тым Валерый Ціхіня падкрэсліў: *«Рана ці позна, але за парушэнні Канстытуцыі ім давядзецца адказваць»*.

Валерый Ціхіня лічыць, што ў сённяшніх умовах нам нельга праводзіць канстытуцыйны рэферэндум. Гэтая заява не засталася галаслоўнай, старшыня КС паслядоўна абгрунтаваў сваю думку. Па-першае, дзяржава манапалізавала сродкі масавай інфармацыі, і мы маем сапраўднага інфармацыйнага монстра, што агрэсіўна навязвае грамадскай думцы прапрэзідэнцкія ідэі. Па-другое, у нашай краіне на ўсіх узроўнях назіраецца прававы нігілізм, вельмі нізкая прававая культура, адсутнічае прававое мысленне. А па-трэцяе, вынікі апошніх сацыялагічных даследванняў паказваюць, што большасць грамадзянаў краіны незнаёмая ні з адным з двух прапанаваных на рэферэндум праектаў канстытуцыі.

Валерый Ціхіня лічыць, што сённяшні Асноўны закон Беларусі адпавядае сусветным стандартам, а калі і патрабуе *«касметычнага рамонту»* — то не цяпер і не шляхам рэферэндуму. Выносячы на рэферэндум свой праект канстытуцыі, сказаў В.Ціхіня, прэзідэнт раскалоў нашае грамадства, *«паставіў яго на дыбкі»*. Самым лепшым выйсцем для Беларусі, на думку старшыні КС, будзе варыянт, калі абодва бакі адклічуць свае праекты і будуць кіравацца дзеючай Канстытуцыяй.

А.Абрамовіч — «хросны бацька» прэзідэнцкай канстытуцыі.

«Хросным бацькам» прэзідэнцкага праекта В.Ціхіня назваў намесніка кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта Аляксандра Абрамовіча. У свой час, будучы дэканам юрыдычнага факультэта БДУ, Ціхіня прыняў Абрамовіча на працу. Сёння былыя калегі — па розныя бакі барыкадаў. *«Нядаўна я заявіў Абрамовічу,* — па-мужчынску цвёрда сказаў В.Ціхіня, — *што, падрыхтаваўшы такі праект, ён зняславіў беларускую юрыспрудэнцыю — а таму павінен здаць свой дыплом юрыста»*.

А ў юрыдычнай кампетэнтнасці і прафесійнай годнасці членаў КС В.Ціхіня не сумняваецца: *«Канстытуцыйны суд будзе гарантам Канстытуцыі — якая б сітуацыя ні склалася»*. Не баіцца сп.Ціхіня і за сябе. Ён пацвердзіў, што супраць яго збіраецца кампрамат (падслухоўваюцца тэлефонныя размовы, збіраюцца чуткі і г.д.). Аднак В.Ціхіня як юрыст маўчаць не будзе. *«У мяне ўся сям'я юрысты — жонка, дачка, сын, родзічы. І калі ўлады ўсё ж арганізуюць якія-небудзь правакацыі, у судзе маім адвакатам будзе жонка»*, — заявіў Валерый Ціхіня.

Віктар ВАЛАДАШЧУК

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Генсек АБСЕ заяўляе...

Генеральны сакратар арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе Дж.Арагона пасля візіту ў Мінск зрабіў заяву ў пастаянным савеце АБСЕ ў Вене.

У заяве, у прыватнасці, гаворыцца: *«25 верасня ў Мінску я меў размову з прэзідэнтам Беларусі і іншымі прадстаўнікамі ўрада. Падчас дыскусіі закраналіся пытанні правоў чалавека ў Беларусі, і я звярнуў увагу маіх суразмоўцаў, што цеснае супрацоўніцтва ў гэтай галіне павінна быць у сферы іх інтарэсаў, паколькі Беларусь з'яўляецца паўнапраўным членам АБСЕ. Аднак у выніку размовы я зразумеў, што беларускі ўрад згодны толькі на ўдзел экспертаў АБСЕ ў прававой ацэнцы заканадаўчых і канстытуцыйных пытанняў, звязаных у тым ліку і з абвешчаным рэферэндумам. Ні да якіх іншых пагадненняў мы не прыйшлі».*

Б.П.

Адвакат Калеснікаў збіраецца абараняць не толькі ўкраінцаў, але і сябе

Мінскі адвакат Уладзімір Калеснікаў абверг апублікаванае ў некаторых СМІ паведамленне, нібыта ён быў пазбаўлены ліцэнзіі і папрасіў палітычнага прытулку ва Украіне.

Памылковай назваў адвакат і інфармацыю пра тое, быццам бы Вярхоўны суд адхіліў касацыйную скаргу па выніках працэсу над сямю грамадзянамі Украіны, якія прымалі ўдзел у Чарнобыльскім шляху.

Нагадаем, што гэтая справа разглядалася ў Мінскім гарадскім судзе пад старшынствам суддзі Казырыцкага. Усе абвінавачаныя былі прызнаныя вінаватымі і атрымалі розныя тэрміны зняволення. На працягу пэўнага тэрміну гэтае рашэнне суда можна было абскардзіць, і гэта было зроблена адвакатамі. У канчатковым выглядзе скарга паступіць у Вярхоўны суд пасля таго, як адвакаты азнаёмяцца з пратаколам працэсу, які дагэтуль ім не прадастаўлены па вельмі банальнай прычыне — з-за хваробы сакратара суда. *«Такім чынам, ні аб якім адхіленні скаргі Вярхоўным судом гаворка не можа ісці, паколькі справа туды яшчэ нават не трапіла»*, — сказаў Уладзімір Калеснікаў.

Адвакат пакуль не бярэцца вызначыць, чым — памылкай ці правакацыяй — з'яўляюцца чуткі аб пазбаўленні яго адвакацкай ліцэнзіі і ягонай спробе папрасіць палітычнага прытулку ва Украіне. *«Дагэтуль ніякага ціску на сябе я не адчуваў, ніякіх пісьмаў з пагрозамі ці званкоў не атрымліваў, але цяпер не ведаю, што думаць. Відавочна адно: публікацыі значна пашкодзілі майму прафесійнаму рэнамэ».* Адвакат збіраецца падаць у суд на тыя выданні, што распаўсюдзілі дэзінфармацыю.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Нацбанк пакуль пад двайным кантролем

Барацьба паміж парламентам і прэзідэнтам працягваецца не толькі ў палітычнай сферы, але і ў фінансава-заканадаўчай.

На мінулым тыдні Вярхоўны Савет абмяркоўваў пытанні, якія тычыліся паўнамоцтваў галінаў улады ў кіраванні Нацыянальным банкам, а таксама пытанні ўнутранага доўгу краіны.

Дэпутаты прынялі Закон «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон аб Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь», у якім захавалі падсправаздачнасць Нацыянальнага банка парламенту. Напрыклад, пытанне аб зняцці старшыні праўлення ў адпаведнасці з гэтым законам можа ставіцца як па прапанове прэзідэнта РБ (на чым настойвала выканаўчая ўлада), так і па ініцыятыве Вярхоўнага Савета. Нацыянальны банк па-ранейшаму падсправаздачны Вярхоўнаму Савету, хаця былі спробы ўвесці пэўныя абмежаванні кантрольных функцый парламента.

У той жа час парламентарыі пайшлі насустрач Нацбанку ў такой паважнай справе, як наданне галоўнаму банку краіны большых паўнамоцтваў у справе кантролю над камерцыйнымі банкамі, бо гэтага патрабуе крызіснае становішча банкаўскай сістэмы.

Быў таксама прыняты Закон «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь аб унутраным дзяржаўным доўгу». У працэсе абмеркавання не была падтрыманая прапанова прэзідэнта, у адпаведнасці з якой Кабінету міністраў надавалася права вызначаць, хто будзе прыцягваць пазыкі ад юрыдычных і фізічных асобаў, рэгуляваць унутраны доўг і весці адпаведны рэестр. Парламент пакінуў у сіле сённяшнюю заканадаўчую норму: прамая адказнасць за гэтыя функцыі ляжыць на Кабінеце міністраў і міністэрстве фінансаў.

Калі б была прынятая прэзідэнцкая папраўка, ўнутраны доўг краіны і выпуск дзяржаўных каштоўных папераў мог выйсці з-пад кантролю. Не выключана, што Кабінет міністраў мог бы «ўпаўнаважыць» які-небудзь калядзяржаўны, нават не прадугледжаны Канстытуцыяй, орган — напрыклад, усюдыіснае і нікому не-падсправаздачнае кіраўніцтва справамі прэзідэнта. А рабіць грошы гэтае ведамства Івана Ціцянкова ўмее добра — толькі заўсёды ў абыход бюджэту.

Алесь САДОЎСКІ

Ці будзе Народны фронт удзельнічаць у рэферэндуме і давыбарах Вярхоўнага Савета? З артыкула, які публікуецца ніжэй, вынікае, што БНФ канчаткова вырашыў не вылучаць сваіх кандыдатаў і не ісці галасаваць, але наладзіць вельмі жорсткі кантроль за ходам галасавання.

Побач мы друкуем меркаванне аднаго з нашых аналітыкаў, які лічыць гэтае рашэнне памылковым.

Каб не шкадаваць аб тым, што зроблена, трэба спачатку добра падумаць

Народны Фронт не можа заклікаць людзей байкатаваць рэферэндум, паколькі гэта забаронена законам. Аднак мы маем права тлумачыць выбаршчыкам, што, ў адпаведнасці з Канстытуцыяй, выбары і рэферэндум з'яўляюцца свабоднымі і ніхто не можа прымусіць чалавека ўдзельнічаць ці няўдзельнічаць у галасаванні — гэтае пытанне ён вырашае асабіста.

Мы выдатна разумеем, што для сённяшняга рэжыму рэферэндум ёсць сродак пазбегнуць адказнасці за развал эканомікі, за жабрацкі стан нашага народа, за шматлікія парушэнні Канстытуцыі і законаў краіны. Акрамя таго, «адабрэнне» на рэфэрэндуме прэзідэнцкай канстытуцыі з'явіцца прававым замацаваннем ужо па сутнасці існуючага сёння рэжыму асабістай таталітарнай улады.

Таму прэзідэнт і заявіў, што не будзе праводзіць рэферэндум па правілах Вярхоўнага Савета, таму і не падпісаў унесеныя парламентам змены ў закон аб рэфэрэндуме, якія, дарэчы, значна змяншаюць магчымасць розных фальсіфікацыяў. Адначасова з боку адміністрацыі прэзідэнта робяцца захады, каб узяць пад свой поўны кантроль увесь ход галасавання.

У такіх умовах весці размову аб тым, колькі працэнтаў галасоў будзе «за» ці «супраць» па выніках рэферэндуму, не выпадае. Гэта можна рабіць толькі пры ўмовах хаця б мінімальнага выканання законаў, калі назіральнікаў не заганяюць у кут за спіны міліцыянтаў, а ёсць магчымасць ажыццяўляць эфектыўны кантроль за падлікам бюлетэняў. Калі ж такой магчымасці няма, то занадта высокая верагоднасць таго, што галасы «супраць» пры падліку бюлетэняў зробяцца галасамі «за». Але ў нас ёсць магчымасць кантраляваць колькасць прыняўшых удзел у галасаванні. Перашкодзіць такому кантролю вельмі цяжка — для гэтага трэба нагогул забараніць прысутнасць незалежных назіральнікаў на ўчастках для галасавання.

Такім чынам застаецца адзіны эфектыўны сродак паўплываць на выніку рэфэрэндуму — гэта тлумачыць людзям, якія не жадаюць усталявання ў Беларусі дыктатуры, што калі яны прыйдуць на выбарчы ўчастак, каб прагаласаваць «супраць» лукашэнкаўскай канстытуцыі, то вельмі высокая верагоднасць таго, што іх галасы будуць падлічаныя як пададзеныя «за». А ці варта ў такой сітуацыі ісці галасаваць — яны вырашаць самі.

Каб мець уяўленне, чаго можна чакаць ад рэфэрендуму-96, прыгадаем мінулы год. У рэферэндуме 1995 года, які адбываўся адначасова з выбарамі ў Вярхоўны Савет, прыняло ўдзел 64,8% выбаршчыкаў краіны. Пры гэтым быў «арганізаваны» амаль поўны ўдзел у рэфэрэндуме сельскіх жыхароў, якія, дарэчы, складаюць каля 20% выбаршчыкаў нашай краіны і дагэтуль з'яўляюцца самымі залежнымі ад свавольства мясцовага начальства. У буйных гарадах колькасць прагаласаваўшых амаль паўсюдна не перавышала 51—55%. Пры гэтым, як вядома, за змену сімволікі прагаласавала 48,7% ад агульнай колькасці выбаршчыкаў. Да месца будзе нагадаць, што па афіцыйных выніках першага тура прэзідэнцкіх выбараў за А.Лукашэнку прагаласавала каля 42% выбаршчыкаў — гэта ягоны «чысты» электарат, а ў другім туры за будучага прэзідэнта прагаласавала каля 56%.

Як сцвярджаюць сацыёлагі, з улікам натуральных зменаў у складзе людзей, унесеных у спісы для галасавання (частка моладзі, перасягнуўшы 18-гадовы ўзрост, атрымала права галасаваць, а частка састарэлых людзей, на жаль, памерла, не дачакаўшыся лепшай долі), прэзідэнта сёння падтрымлівае не больш як 40% выбаршчыкаў. Для перамогі на рэфэрэндуме неабходна будзе «дабраць» яшчэ каля 15-20% галасоў. Калі ў рэферэндуме-96 прыме ўдзел больш за 50% выбаршчыкаў, то гэтыя галасы будзе адкуль «узяць». Калі ж колькасць людзей, якія не пойдуць галасаваць, таму што хацелі б прагаласаваць супраць прэзідэнцкай канстытуцыі, але не жадаюць, каб іх галасы залічылі як «за», складзе хаця б 20% ад агульнай колькасці маючых права голасу, то рэфэрэндум не адбудзецца, бо ў ім прыме ўдзел меней за 50% выбаршчыкаў, унесеных у спісы для галасавання. Гэта азначае, што рэфэрэндум не толькі будзе **прайграны** сённяшнім рэжымам і **практычна**, і **юрыдычна**, але ж і будзе развеяны міф аб усенароднай падтрымцы «усенароднаабранага прэзідэнта».

Аднак знойдзецца дастаткова палітыкаў, якія шчыра лічаць сябе дэмакратамі, што дбаюць пра свой народ, але якія не зрабілі высновы з вынікаў мінулага рэферэндуму. Яны будуць весці агітацыю за сябе і, магчыма, супраць прэзідэнцкай канстытуцыі, але ж будуць мусіць заклікаць людзей прыйсці на выбары — а гэта значыць і на рэфэрэндум! Дарэчы, у гэтым выпадку будут «прыцягнуты» на ўчасткі для галасавання не толькі свае прыхільнікі, але ж і тыя, хто будзе галасаваць супраць іх і за прэзідэнцкую канстытуцыю. Вядома, ўлады, упэўненыя, што калі рэфэрэндум адбудзецца, то яны яго абавязкова выйграюць, не будуць перашкаджаць такім кандыдатам, як гэта было раней, а можа, нават, і дапамагаць будуць — па прэзідэнцкай канстытуцыі парламент будзе служыць добрай шырмай для дыктатуры. Таму наяўнасць у прэзідэнцкім парламенце быццам бы апазіцыйных дэпутатаў будзе толькі карысная — можна будзе крычаць на ўвесь свет: «Якая ж гэта дыктатура, калі ў парламенце крытыкуюць прэзідэнта?». І ў дэпутатаў-дэмакратаў сумленне будзе чыстае — крытыкуем жа!

Але ж не ўсё так змрочна. Трэба разбудзіць у нашых грамадзянаў звычайнае чалавечае пачуццё самазахавання. Гэта можна зрабіць пры ўмове, што ўсе антыдыктатарскія сілы краіны здолеюць аб'яднаць свае намаганні, калі ў іх хопіць сталасці, каб стрымаць свае амбіцыі, каб зразумець, што тыя тактычныя «плюсы», якія даюць «выбары-рэфэрэндумы» (дарэчы, як і іншыя палітычныя гульні) памагаюць закрэсліць стратэгічную перспектыву нашай краіны, нашага народу (ды і іх асабістую таксама), то **дыктатура не пройдзе!** А потым ужо можна думаць і пра дэпутацтва, і пра ўладу. Бо ўлада (у прыватнасці, для Народнага фронту) патрэбная не сама па сабе, а як сродак для адраджэння Бацькаўшчыны, для стварэння ўмоваў годнага, чалавечага жыцця для ўсіх грамадзянаў Рэспублікі Беларусь.

Не выключана магчымасць, што рэжым паспрабуе правесці рэферэндум 7 лістапада. Нездарма так грунтоўна, з прэтэнзіяй на легітымнасць, рыхтуецца вертыкаллю так званы ўсебеларускі сход. Калі гэты неканстытуцыйны сход, насуперак Вярхоўнаму Савету, «перанясе» дату правядзення рэферэндуму, то такі рэферэндум будзе цалкам незаконны. Тады будзе цалкам законна байкатаваць яго. Але ж і ў гэтых варунках неабходна будзе весці растлумачальную працу сярод насельніцтва і наладжваць самы жорсткі кантроль за ходам галасавання. Што да выбараў, то калі пераможа рэжым — выбары ў Вярхоўны Савет проста не адбудуцца.

Валянцін АСТАШЫНСКІ,
старшыня інфармацыйна-аналітычнай камісіі,
сакратар Управы Сойму БНФ «Адраджэньне»

У пошуках страчанай... рэвалюцыі

Сойм Беларускага народнага фронту прыняў рашэнне не ўдзельнічаць у давыбарах дэпутатаў Вярхоўнага Савета і рэферэндуме

Пры гэтым Сойм не паставіў задачу пра пераход на нелегальную працу або, скажам, пра перавод усёй дзейнасці ў эміграцыю. Фронт папросту не будзе ўдзельнічаць у публічнай палітыцы, у легітымным або нелегітымным палітычным жыцці краіны.

Гэтая, на маю думку, чарговая памылка апазіцыйнай арганізацыі — не што іншае, як самаўхіленне БНФ.

У мітынгах Народны фронт будзе ўдзельнічаць разам з партыямі «круглага стала», якія ідуць на давыбары. Але голае адмаўленне рэжыму, калі побач выступаюць з сваімі праграмамі дэпутаты, ужо нікога не пройме. Рашуча ганьбіць Лукашэнку, не прапануючы пры гэтым сваю канкрэтную асобу публічнага палітыка альбо групу такіх палітыкаў, альбо нейкую іншую рэальную (гэта значыць, ужо падрыхтаваную) сістэму ўлады, — бесперспектыўна.

«Ухіленне ад правакацыяў», якое з нейкага часу стала генеральнай лініяй БНФ, ператвараецца ва ўхіленне ад рэальнай палітыкі ўвогуле.

Сапраўды, небяспечна выходзіць з дому, бо на вуліцы можна трапіць пад аўтамабіль. Што зробіш, калі ўся палітыка ў сучаснай Беларусі — гэта правакацыя?!

Але ж рэальны сучасны беларускі палітык мусіць існаваць у **гэтай** краіне, усведамляючы, што **тут** змены масавае свядомасці будуць адбывацца яшчэ вельмі і вельмі доўга. І каб на працягу гэтага перыяду захаваць краіну, трэба ва ўсіх гэтых зменах калі не ўдзельнічаць, то хоць бы **прысутнічаць**.

За апошнія пяць гадоў апазіцыйны БНФ процістаяў тром тыпам улады: уладзе старшыні ВС, старшыні саўміну і цяпер — прэзідэнта. Рашучае адмаўленьне і Шушкевіча, і Кебіча, і Лукашэнкі можна было б прыняць, калі б за гэтым адмаўленнем ішло сцвярджэнне чагосьці іншага — бээнэфаўскай альтэрнатывы. Але чым далей, тым гэтая альтэрнатыва выглядае ўсё больш цьмяна. Спачатку Фронт страціў сваю фракцыю ў ВС, потым за мяжу выехаў лідэр арганізацыі, цяпер — няўдзел у давыбарах...

Калі б БНФ наладзіў свой нелегальны друк (хоць навошта ён, калі Фронт амаль не ўдзельнічае ў сённяшняй незалежнай прэсе) або пачаў ствараць сваё апалчэнне ці штосьці падобнае, — то ягонае рашучае адмаўленне можна было б зразумець. Але нічога такога не адбываецца. Таму, застаючыся масавай нацыянальнай арганізацыяй — манапалістам нацыянальнай ідэі, БНФ ператвараецца ў арганізацыю накшталт Таварыства беларускай мовы, у непалітычную суполку, якая разважае не ў катэгорыях уласнае легітымнасці, а ў катэгорыях капрызу — вось каб не было Лукашэнкі і нас запрасілі...

Некалі, пасля таго, як ВС адмовіўся праводзіць ініцыяваны Фронтам рэферэндум, фракцыя БНФ, на маю думку, павінна была пакінуць парламент і цалкам аддацца «вулічнай» палітыцы. Тады на тое была і адпаведная сітуацыя ў краіне, і Фронт быў адзінай рэальнай апазіцыйнай сілай са сваімі публічнымі палітыкамі. Але тады Фронт гэтага не зрабіў. Сёння ён паўтарае сваю памылку, робячы ўсё наадварот.

Адбудуцца давыбары з рэферэндумам ці не адбудуцца — Фронт ад гэтага не страціць нічога, калі будзе ўдзельнікам палітычнага жыцця. У адваротным выпадку ягонае месца ў гэтым жыцці зоймуць «проста демократы», і, каб вярнуцца на сваё месца, каб зноў звязаць дэмакратыю з беларушчынай, спатрэбіцца сапраўдная рэвалюцыя. Падобна, што народная рэвалюцыя («румынскі варыянт») — гэта сёння адзіны арыентыр і надзея БНФ.

Але не трэба быць занадта празарлівым, каб, назіраючы за станам масавае свядомасці ў Беларусі, зразумець: ніякай рэвалюцыі не будзе.

Сяргей ДУБАВЕЦ

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
1 кастрычніка 1996 г., № 74

Мясникович ходил убеждать КГБ

Как известно, президентская администрация установила персональную ответственность высокопоставленных чиновников за результаты голосования на референдуме в закрепленных за ними регионах страны. Незавидный участок достался Михаилу Мясниковичу.

Глава администрации получил «по конвенции» не спокойную и благопристойную провинцию, а кипящий политическими страстями Минск. В роли проводника идей президента г-н Мясникович 20 сентября посетил штаб-квартиру КГБ.

Мясникович хитро опускает глаза...

Здесь будет уместно вспомнить, как в июне 1994 г. Александр Лукашенко после победы в первом туре президентских выборов пришел на встречу в центральный аппарат КГБ, где выступил с пламенной речью в привычном стиле борца с коррупцией. Тогда из зала прозвучал вопрос о будущей судьбе *«самого богатого человека в Беларуси — первого вице-премьера Михаила Мясниковича»*. Александр Лукашенко со свойственной ему решительностью и безапелляционностью заявил, что *«назначение будет предшествовать тщательная проверка»*.

И вот теперь уже сам Мясникович с трибуны клуба им.Дзержинского говорил о судьбоносности предстоящего референдума и необходимости принятия президентского варианта конституции. По его словам, это позволит более эффективно и безболезненно преодолеть кризисные явления в экономике. Им было подчеркнуто, что сотрудники ведомства должны ориентироваться на установленную Александром Лукашенко дату плебисцита, т.е. 7 ноября. Далее последовало нечто не совсем внятное и смахивающее на робкий инструктаж. Дескать, чекисты должны внимательно отслеживать ситуацию, не допускать ее обострения и своевременно информировать о «вражеских» поползновениях.

Тем не менее из выступления г-на Мясниковича собравшиеся поняли, что нынешние власти при всей напускной уверенности в завтрашнем дне явно обеспокоены результатами будущего голосования.

Как поведет себя КГБ в этой ситуации? Примитивная агитация на сотрудников этого ведомства уже не действует, о чем свидетельствует высказывание одного из них: *«В отличие от военнослужащих внутренних войск, которые в силу непонимания способны пойти на выполнение любых приказов, мы всегда задумываемся — кому и почему эти приказы выгодны. Оказаться на плахе из-за чьей-то амбициозности, как в пятидесятые годы, — перспектива малоприятная»*.

Однако это вовсе не означает, что КГБ проникся исключительно чувством соблюдения правовых норм. Просто предстоящий исход противостояния «президент — парламент» пока трудно предсказуем.

Сергей АНИСЬКО, *«БДГ»*

«Челноки» продолжают борьбу

На прошлой неделе в Минске состоялась вторая акция протеста «челноков». На этот раз их поддержали предприниматели Бреста, Могилева и Гродно

В четверг, 26 сентября, на территории стадиона «Динамо» не было торговли, прекратили работу и на авторынке, частично на Комаровке и других рынках Минска. Выражая солидарность с минчанами, не работали также крупнейшие рынки других городов. «Динамовцы» провели профсоюзное собрание, на котором помимо организационных вопросов обсуждалась и сложившаяся ситуация с налогообложением.

Администрация рынка на этот раз была менее снисходительна к «челнокам» и, насколько это возможно, препятствовала проведению собрания: предпринимателям отказались предоставить громкоговоритель, не разрешили пройти к трибунам стадиона, заглушали ведущих многочисленными объявлениями по радио и т.д.

Не обращая внимания на провокации, предприниматели сумели даже выслушать представителей Верховного Совета, которые пришли на собрание поддержать «челноков» и разъяснить свою позицию. Смельчаками оказались члены фракции «Гражданское действие». Они заверили предпринимателей, что «налоговый» вопрос рассматривается Верховным Советом, и уже разработано (правда, еще не принято) законодательство о поддержке малого бизнеса. Из уст членов фракции прозвучал и призыв к вступлению предпринимателей в политическую борьбу, так как сегодня принятие парламентом законодательных актов, облегчающих жизнь малому бизнесу, вовсе не означает их исполнения.

Таким образом, от встречи депутатов с «челноками» был достигнут двойной эффект. Во-первых, предприниматели доверили свои проблемы парламентариям и осознали необходимость решать экономические проблемы в том числе и политическими методами. Во вторых, представители ВС, лишенные доступа в теле- и радиоэфир, а также на страницы государственных газет, смогли выступить перед массой народа.

Что же касается совместной работы представителей малого бизнеса с городскими властями по поводу изменения решения Мингорисполкома о введении сверхналогов, то пока единственным реальным результатом стала крайне равнодушная реакция на «челноков» со стороны властей.

Время, определенное в решении на уплату твердых налогов, уже пришло, тем не менее проект об изменении этого документа еще не подписан. В этой связи «челноки» сняли с себя ответственность за неуплату налогов (в настоящий момент так и не существует окончательного документа, согласно которому должны взыматься эти налоги), налоговые инспекции же рыщут по рынкам, штрафуя и угрожая финансовыми санкциями тем, кто еще не уплатил.

В течение этой недели предпринимателям обещают непременно «решить их вопрос» и возможно даже отодвинуть действие документа о введении твердых ставок налогов на начало следующего года. Учитывая, что обещаниями «челноки» уже сыты, в случае отсутствия конкретного решения к концу недели не исключены повторные акции. Неужели власти не могут понять, что они играют с огнем, рискуя довести до того, что вся гвардия малого бизнеса (а это порядка 1 млн. человек по Беларуси) соберется вместе и попытается отстаивать свои права уже не на стадионе.

Вероника СТРОЕВА

Спачатку рэферэндум, грошы – потым

З відавочнай мэтай павялічыць сваю папулярнасць напярэдадні рэферэндуму Аляксандр Лукашэнка падпісаў новы ўказ з прыемнай назвай «Аб павелічэнні памеру стыпендый аспірантам, студэнтам вышэйшых і навучэнцам сярэдніх спецыяльных навучальных установаў».

У адпаведнасці з гэтым дакументам з 1 студзеня 1997 г. павінны павялічыцца дзяржаўныя стыпендыі, у тым ліку іменныя стыпендыі ўсіх відаў і стыпендыі аспірантам — на 50%, мінімальныя навучальныя стыпендыі — на 25%, сацыяльныя стыпендыі — на 30%.

Дзіўна, што галасы моладзі спрабуюць купіць такой мізэрнай падачкай. Відавочна, што такое павелічэнне 200-тысячнай стыпендыі — прычым не адразу, а некалі ў пасляравферэндумнай будучыні — не вызваліць студэнтаў ад неабходнасці альбо самім зарабляць на жыццё, альбо выпрошваць грошы ў бацькоў.

Тым жа, хто спадзяецца на прэзідэнцкія абяцанні, трэба нагадаць расійскі прыклад. Барыс Ельцын перад выбарамі паабяцаў падтрымку і датацыі самым розным катэгорыям насельніцтва. Не прайшло і некалькіх месяцаў пасля выбараў, як ён, «улічваючы цяжкае становішча дзяржаўнага бюджэту», адмовіўся ад большасці сваіх абяцанняў. А Лукашэнка, як вядома, любіць браць прыклад са свайго старэйшага брата.

Алесь САДОЎСКІ

БЕЛАРУСКІ ФОНД СОРАСА
абвяшчае конкурс праектаў
«ЭКАЛАГІЧНАЯ АДУКАЦЫЯ СТУДЭНТАЎ»
у межах праграмы
«ЭКАЛОГІЯ»
На конкурс прымаюцца праекты як ад асобных аўтараў, так і творчых груп.
Праекты падаюцца ў выглядзе заявак на грант па форме, якую можна атрымаць у Беларускім Фондзе Сораса або ў яго абласных аддзяленнях:
220027 г. Мінск, пр. Ф.Скарыны, 65, корпус 11А БДПА, пакой 107, Беларускі Фонд Сораса
210026 г. Віцебск, вул. Замкавая, 4, пакой 215, Віцебскае аддзяленне БФС
246652 г. Гомель, вул. Кірава, 32-а, Гомельскае аддзяленне БФС
Заяўкі, пададзеныя не па форме, не разглядаюцца.
Праекты могуць мець толькі некамерцыйны характар.
Увага! Для ўдзельнікаў конкурсу будзе праведзены семінар па пытаннях складання і афармлення заявак на грант - **25 кастрычніка а 18 гадзіне па адрасе Беларускага Фонду Сораса.**
Апошні тэрмін падачы заявак - 1 лістапада 1996 года (па паштовым штэмпелі).
Заяўкі дасылаюцца на адрас Беларускага Фонду Сораса, з пазнакай **«Экалагічная адукацыя студэнтаў».**
©гольфстрым 072

«Жучкі» – гэта актуальна

КДБ абвяргае Лукашэнку ці проста адмаўляецца ад сваіх «жучкоў» у замежных амбасадах?

Афіцыйны Мінск «безмолвствует», ніяк не адказваючы на запыты заходніх краінаў з нагоды ўскоснага прызнання Аляксандрам Лукашэнкам факту, што падначаленыя яму спецслужбы праслухоўваюць замежныя амбасады. Натуральна, у гэтым ніхто не сумняваўся, аднак прамых доказаў пакуль не было. Зрэшты, спецслужбы палічылі патрэбным абвергнуць выказванні кіраўніка дзяржавы.

Так, традыцыйна дасведчаная ў кадэбэшных справах газета «Свободные новости-плюс» у апошнім нумары са спасылкай на крыніцу ў кіраўніцтве КДБ паведаміла, што А.Лукашэнка сапраўды даведаўся пра сустрэчу дыпламатаў 11 верасня і тэму іх размоваў *«не без помощи этой структуры»*.

Разам з тым, што цікава, тыднёвік друкуе ўскоснае абвержанне КДБ наконт знаходжання ў амбасадах падслухоўвальнай апаратуры. Ананімная «крыніца інфармацыі» сцвярджае ў «СН-плюс», што нібыта *«у КГБ сегодня иные методы работы»*.

Паўлюк ЛОСЬ

Па сцэнарыі сталінскіх часоў

А.Лукашэнка вылучаны прадстаўніком ад калгаса «Азёры» Гродзенскага раёна на «ўсебеларускі сход»

Крыху смешна, што самога арганізатара і галоўную дзеючую асобу мерапрыемства яшчэ трэба выбіраць, як аказваецца, і дэлегатам. Прычым не ад прэзідэнцкай адміністрацыі, а ад калгаса, у якім Лукашэнка не працаваў ані дня. Затое прэзідэнт не так даўно выдзеліў «Азёрам» 4 млрд. рублёў (дарэчы, гаспадаркай кіруе сын старшыні Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр Дубко). Як бы ў адказ кіраўніцтва калгаса пералічыла на правядзенне рэферэндуму 10 млн. рублёў і, як па нотах, правяло абранне Лукашэнкі на «ўсебеларускі сход».

На калгасны сход былі прызначаныя 209 упаўнаважаных членаў гаспадаркі, з якіх восем не з'явіліся. Замест іх у залу запрасілі жыхароў вёскі Азёры, якія галасавалі нароўні з упаўнаважанымі. Як зазначыў у прыватнай гутарцы адзін чыноўнік, усе прыбылі памытыя, паголеныя, прыадзетыя і накормленыя, а вяскоўцы ў сваю чаргу гаварылі, што такую колькасць людзей не зганялі дагэтуль ні на адно мерапрыемства.

Адзін за адным калгаснікі пачалі расхвальваць прэзідэнта РБ, адчувалася, што ўсё вельмі добра адрэпеціравана. Галоўны заатэхнік А.Шышко адразу прапанаваў абраць прадстаўніком ад іхняга калгаса на «ўсебеларускі сход» прэзідэнта А.Лукашэнку. Ён абгрунтаваў сваю прапанову словамі пра тое, што прэзідэнт узваліў на свае плечы цяжкую ношу і робіць тытанічныя высілкі, каб вылечыць эканоміку. Аператар машыннага даення В.Суворава заклікала аднавяскоўцаў аб'яднацца вакол прэзідэнта, бо ён вельмі стараецца і ўвогуле выйшаў з простых людзей. Даярка з замілаваннем узгадала, як у жніўні Лукашэнку ўручылі ў Азёрах сноп збожжа. Пра гэтак званую «прастату прэзідэнта» гаварылася і ў астатніх выступах. Калгасны галоўны ўрач нават сказала, што калі ва ўсім падтрымаць прэзідэнта, дык жыццё ад гэтага стане здаравейшым (нібыта Лукашэнка доктар). Карацей, ***«жить станет лучше, жить станет веселее»***.

Дарэчы, як толькі прамоўцы адымалі вочы ад паперы, яны пачыналі блытацца, называлі сход «совещанием», прычым нават агульнасаюзным. Увесь гэты спектакль адбываўся 20 хвілін. Супраць вылучэння Лукашэнкі прагаласаваў толькі адзін чалавек, і адзін устрымаўся. Калгаснікі прынялі зварот да ўсіх беларусаў, просячы цалкам ухваліць канстытуцыю Лукашэнкі, які ***«з вялікім стараннем змагаецца за ўмацаванне нашай дзяржавы»***.

Азёрскі сход вельмі нагадвае апошнія сталінскія выбары, якія адбыліся ў лютым 1953 г. Дастаткова ўзяць падшыўку абласной газеты за той час. Тады даходзіла да абсурду, бо Сталіна разам з яго Палітбюро выбіралі ад розных калектываў дэпутатамі ў Гродзенскі абласны савет! І гаварылася пра Іосіфа Вісарыёнавіча прыблізна тое ж, што сёння гавораць пра Аляксандра Рыгоравіча: *«Дзякуй вялікаму Сталіну за бацькоўскія клопаты аб працавітанні беларускага народа»*, *«Каб не было больш гора, мацярынскіх слёз, каб заўсёды нам свяціла сонца, мы галасуем за Сталіна!»*. Або ўвогуле на тэму дня — *«Творцу самай дэмакратычнай канстытуцыі ў свеце таварышу Сталіну — ура!»*. Лукашэнка стварыў праект самай недэмакратычнай у Еўропе канстытуцыі, а ўхваляюць яе такім жа чынам, як было за сталінскім часам. Простыя людзі, а тым больш калгаснікі, не задумваюцца над тым, што яны дапамагаюць сёння стварыць беларускага Сталіна.

Дарэчы, ужо пачалося спаборніцтва за вылучэнне правадыра. Следам за калгасам «Азёры» прэзідэнта Лукашэнку выбраў сваім прадстаўніком на «ўсебеларускі сход» і Брэсцкі пагранатрад. Хто наступны?

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СПОРТ

Мінск ці Мазыр?

ФУТБОЛ:
ЧЭМПІЯНАТ БЕЛАРУСІ

У 24-м туры галоўная ўвага, вядома, была прыкавана да матчаў лідэраў. На жаль, вынік гульні «Дынама» (Мінск) — «Атака-Аўра», якая адбылася ў панядзелак увечары, мы па тэхнічных прычынах паведаміць не можам. МВКЦ (Мазыр) гуляў у сталіцы з «Дынама-93» і выцягнуў перамогу — 2:1. Звяртае на сябе ўвагу і другая запар перамога магілёўскага «Тарпеда-Кадзіна» — на гэты раз у гасцях над мінскім аднаклубнікам — 1:0. Поспех дазволіў камандзе Міхаіла Баса скокнуць уверх адразу на тры з паловай прыступкі.

Астатнія гульні скончыліся так: Дынама (Брэст) — Нафтан-Дэвон (Наваполацк) — 3:0. Лакаматыў-96 (Віцебск) — Шахцёр (Салігорск) — 3:2, Нёман (Гродна) — Абутнік (Ліда) — 1:1, ФК Маладзечна — Белшына (Бабруйск) — 0:0. Днепр (Магілёў) — Ведрыч (Рэчыца) — 2:1.

		Г	А
1.	МВКЦ	24	62
2.	Дынама (Мінск)	23	60
3.	Белшына	24	51
4.	Атака-Аўра	22	41
5.	Лакаматыў-96	24	41
6.	Дынама-93	22	37
7.	Нафтан-Дэвон	24	37
8.	Днепр	24	34
9.	ФК Маладзечна	24	33
10.	Дынама (Брэст)	24	27
11.	Шахцёр	24	19
12.	Тарпеда-Кадзіна	24	19
13.	Нёман	23	18
14.	Тарпеда	24	18
15.	Абутнік	24	17
16.	Ведрыч	24	15

КУБАК УЛАДАЛЬНІКАЎ КУБКАЎ

Толькі маскоўскі «Лакаматыў» вырашыў задачу выхаду ў 1/8 Кубка кубкаў. Гуляючы ў гасцях з харвацкім «Вартэксам», масквічы прайгралі 1:2, але гэта быў той мінімум, які дазволіў ім працягнуць барацьбу на наступным этапе (дома — 1:0). Украінская «Ніва» з Вінніцы дома прапусціла чатыры сухіх мяча ад швейцарскага «Сьёна» — 0:4 (у гасцях — 0:2). «Канструкторул» (Малдова) і «Дынама» (Батумі, Грузія) на сваім полі два тыдні таму дасягнула сенсацыйных нічыіх у паядынках са знакамітымі «Галатасараем» (Турцыя) і «Эйндховенам» (Галандыя) — 0:0 і 1:1 адпаведна. Але ў Стамбуле (4:0) і Эйндховене (3:0) гаспадары былі бязлітаснымі.

Уладальнік Кубка кубкаў-96 «Пары Сэн-Жэрмэн» (Францыя) мімаход «растаптаў» «Вадуц» (Ліхтэнштэйн) — 3:0 (4:0). Другі фаварыт «Ліверпуль» (Англія) — не меў праблемаў у матчах з «Мю Па-47» (Фінляндыя) — 3:1 (1:0). Як і чакалася згулялі АЕК (Кіпр) — Барселона (Іспанія) — 0:0 (0:2), Фіарэнтына (Італія) — Глёрыя (Румынія) — 1:0 (1:1), Рух (Польшча) — Бэнфіка (Партугалія) — 0:0 (1:5). Сенсацыйна выглядае вынік «Црвена звезда» (Югаславія) — «Кайзэрслаўтэрн» (Германія) — 4:0 (0:1). І яшчэ цікавы факт. Клуб трэцяга (!) французскага дывізіёна «Нім» двойчы святкаваў перамогу над венгерскім «Кішпешт-Гонведам» — 2:0, 2:1.

Жараб'ёўка, якая адбылася ў Жэневе, звяла ў 1/8 Кубка кубкаў «Бэнфіку» (Партугалія) і маскоўскі Лакаматыў», «Барселону» і «Црвену звезду», «Галатасарай» і «Пары Сэн-Жэрмэн». У 1/16 Кубка *UEFA* сустрэнуцца Гамбург (Германія) — Спартак (Масква), Дынама (Тбілісі) — Баавішта (Партугалія), Легія (Варшава) — Бэшыкташ (Турцыя), Рома (Італія) — Карлсруэ (Германія), Барусія (Мёнхенгладбах, Германія) — Манака (Францыя). Гэта цікавейшыя, на наш погляд, пары. Матчы адбудуцца 15—17 і 29—31 кастрычніка.

ШАХМАТЫ:
СУСВЕТНАЯ АЛІМПІЯДА

У 10-м і 11-м турах мужчынская зборная Беларусі пасля няўдач у матчах з Арменіяй-1 і Швецыяй рэабілітавала сябе, перамогшы каманды Туніса — 4:0 і Чэхіі — 2,5:1,5. Дзве перамогі атрымаў Юрый Шульман, па адной — Вячаслаў Дыдышка і Віктар Купрэйчык, Яўген Мачалаў і Аляксей Александраў. Затым было паражэнне ад моцнай каманды Германіі — 1:3. У выніку ў нашых — 26,5 ачкоў і месца ў другой дзесятцы. Лідзіруе ж зборная Расіі з 33,5 ачкамі. Бліскуча гуляе яе лідэр Гары Каспараў.

Жаночая каманда ў трох турах набрала 3,5 ачкоў з 9: нічыя ў 10-м туры з Індыяй — 1,5:1,5 і паражэнне з аднолькавым лікам 1:2 ад Латвіі і Харватыі. Усяго ў беларусак — 18,5. У грузінак, якія ідуць на першым месцы — на дзевяць больш. За два туры да фінішу можна сказаць, што мужчынская зборная Расіі і жаночая зборная Грузіі забяспечылі сабе перамогу ў турніры. Гэтаксама было і два гады таму.

ТЭНІС: ПЕРАМАГАЮЦЬ АМЕРЫКАНЦЫ

Жаночая каманда ЗША выйграла ў Антлантык-Сіці Кубак Федэрацыі, перамогшы ў фінальным матчы іспанак — 5:0. Па дзве перамогі ў адзіночных паядынках прынеслі першая ракетка свету Моніка Сэлеш і алімпійская чэмпіёнка Атланты Ліндсэй Дэвэнпорт, перайграўшыя другую і трэцюю ракеткі свету Аранчу Санчэс і Канчыту Марцінэс. Пятае ачко на рахунку дуэта Фэрнандэс — Мэры-Джо і Джы Джы.

Піт Сампрас (ЗША) стаў чэмпіёнам Швейцарыі ў залах, лёгка адолеўшы ў фінале немца Хенрыка Дрэкмана — 7:5, 6:2, 6:0. У паўфінале Піт выйграў у пераможцы адкрытага чэмпіяната Францыі Яўгена Кафельнікава (Расія) — 7:6, 6:3.

НАСТОЛЬКІ ТЭНІС:
У АДСУТНАСЦЬ ЛІДЭРАЎ

Лепшым на турніры «Беларусь-96», які праходзіў у мінскім Палацы тэніса, сталі Віталь Нехвядовіч і Вікторыя Паўловіч. Не пераменшваючы заслугаў пераможцаў, адзначым, што мацнейшыя майстры малой ракеткі, у тым ліку Уладзімір Самсонаў і Тацццяна Лагацкая, абсалютныя чэмпіёны краіны-96, гуляюць цяпер у чэмпіянатах другіх дзяржаваў за свае клубы.

ВЕЛАСПОРТ:
ВЫНОСЛІВЫЯ ШВЕЙЦАРЦЫ

Алекс Цуле, Лоран Д'юфо і Тоні Рамінгер з Швейцарыі занялі ўвесь п'едыстал па заканчэнні 22-этапнай велагонкі па дарогах Іспаніі «Вуэльта». Знакаміты іспанец Мігель Індурайн праехаў крыху болей паловы трасы і сыйшоў з дыстанцыі.

Сямён ПЛОЦ

У абарону сабак і кошак

Актывісты беларускага аб'яднання аховы хатніх жывёл «Ратаванне» правялі ў мінулую пятніцу пікетаванне Фрунзенскага райвыканкама Мінска. На гэтым тыдні рыхтуецца пікет побач з Домам друку.

«Ратаванне» пратэстуе супраць ганебнага стаўлення ўладаў Мінска да праблемы бадзячых сабак і кошак. Аб'яднанне даўно прапаноўвала айцам горада сумеснымі намаганнямі пабудаваць пункт часовага ўтрымання і размеркавання жывёл, якія не маюць прытулку, і нават за свае грошы прафінансавала падрыхтоўку праекта такой пабудовы, аднак гарадскія ўлады ўсё адказваюць, што ў іх няма сродкаў.

І вось нядаўна актывісты даведаліся, што Фрунзенскі выканкам выдзеліў 3 млн. рублёў на прэміраванне тых, хто зловіць і здасць бадзячую жывёліну: за сабаку прадугледжаная прэмія ў памеры 13 — 18 тысяч рублёў, за ката — 8 тысяч. Гэтая навіна падштурхнула добраахвотных ахоўнікаў жывёлаў да рашучых дзеянняў. Спачатку яны пікетавалі ЖРЭО, дзе трымалі здадзеных сабак і кошак перад іх адпраўкай на скотамагільнік для ўмярцвення. Потым выйшлі з плакатамі да Фрунзенскага выканкама. Пакуль адзіным вынікам гэтай акцыі стала сустрэча з кіраўніком адміністрацыі Фрунзенскага раёна сп.Матусевічам, які паабяцаў толькі, што сабак не будуць страляць прама на вуліцах.

«Лепш аддалі б свае «прэміяльныя» тым, хто можа ўзяць сабак і кошак, — заўважыла прэзідэнт «Ратавання» Людміла Атрашкевіч. — *Мы ў верасні патрацілі дакладна такую ж суму на дапамогу гэтым людзям, і такім чынам выратавалі дзесяткі маленькіх сяброў. На жаль, у чыноўнікаў пакуль лепш атрымліваецца такая справа, як іх знішчэнне».*

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Калі вы маеце электронную пошту, то свежы нумар СВАБОДЫ вы можаце чытаць напярэдадні выхаду газеты ў свет.
Кошт электроннай падпіскі ў межах Беларусі — 5 USD у месяц. Даведкі па тэл. 236-89-40

Рэкламны аддзел «СВАБОДЫ» ПРЫМАЕ ПРЫВАТНЫЯ АБ'ЯВЫ І ВІНШАВАННІ. Даведкі па тэл. 236-24-41

Тел. (8 0172) 104068, 104074. Продается КОПИРОВАЛЬНЫЙ АППАРАТ XEROX-5030/1 (б/у). ЛАЗЕРНЫЙ ПРИНТЕР HP 4Si MX (б/у).

Стэлажы і стойкі
Вырабім з улікам Вашых пажаданняў.
тэл. 236-24-41
Еўрапейская якасць!



ПРАДАЕЦЦА
ПАПЕРА ДЛЯ ПІСАННЯ
Фармат А4. Кошт 10000 р/кг.
Прымаем заказы на фармат А3. Тэл. 236-24-41

ДАЙДЖЭСТ

Сэрца – не камень

Чалавечае сэрца горш працуе па панядзелках і пятніцах.

Менавіта ў гэтыя дні, піша амерыканскі медычны часопіс *Circulation*, найчасцей абвастраюцца сардэчныя хваробы. Такую статыстыку даследчыкі тлумачаць зусім не містычнымі прычынамі: проста на пачатку тыдня людзей спатыкае працоўны стрэс, а ў пятніцу праяўляецца стомленасць.

Увага: ксеракс

Пыл, які выдзяляюць у часе работы капіравальныя машыны, можа быць прычынай сур'ёзных хвароб лёгкіх.

Пра гэта папярэджвае брытанскі тыднёвік *Lancet*. Медыкі ўжо зафіксавалі некалькі выпадкаў, калі ў людзей, чыя праца звязаная з ксеракапіраваннем, развіўся сілікоз — грозная «хвароба шахцёраў». Каб зменшыць рызыку гэтай невылечнай хваробы, ксераксы трэба ўстанаўліваць толькі ў месцах з добрай вентыляцыяй, раіць аўтар матэрыяла, доктар медыцыны Крыстына Атбрустэр з Вены.

Рэкорд італьянца

Італьянец Умбэрта Пэлідзары ўстанавіў новы сусветны рэкорд.

Непадалёк вострава Сардынія ён нырнуў без кіслароднага апарата на глыбіню 131 м!

На здымку: У.Пэлідзары паказвае паднятую з-пад вады таблічку з указаннем глыбіні. *(Фота EPA)*

Гармон для мужчыны

Сенсацыйную навіну паведамляе часопіс *New Scientist*.

Як паказваюць даследванні навукоўцаў універсітэта штата Вісконсін, арганізм мужчын таксама рэагуе на нараджэнне дзяцей. У прыватнасці, узровень пралактыну — гармону, які ў жанчын рэгулюе дзейнасць грудных залозаў, — за два-тры тыдні перад з'яўленнем на свет дзіцяці рэзка ўзрастае і ў цяжарнай, і ў будучага бацькі. На думку даследчыкаў, гармон дапамагае мужчынам псіхалагічна настроіцца на выкананне бацькоўскіх функцый.

Акрамя таго, эксперыменты амерыканскіх вучоных паказваюць, што жанчыны, якія кормяць немаўлят грудзьмі, перажываюць цяжкія стрэсы ўтрая лягчэй, за тых маці, якія даюць дзецям малако або сумесі з бутэлечкі. Спецыялісты Нацыянальнага інстытуту псіхічнага здароўя спадзяюцца, што гэтае адкрыццё можа спрыяць распрацоўцы новых метадаў лячэння стрэсаў — гаворка ідзе ўжо не пра кормячых маці, а пра самых звычайных пацыентаў.

Біць жонак нельга

Але гэта не заўсёды з'яўляецца злачынствам.

Да такой высновы прыйшоў Вярхоўны суд Італіі, адмяніўшы пакаранне жыхару Сіцыліі Ф.Ламбарда. У парыве рэўнасці ён даволі моцна збіў сваю жонку, і мясцовы суддзя першапачаткова прызначыў яму 8 месяцаў турмы. Вярхоўны суд устанавіў, што канфлікт меў месца «паміж перыядамі згоднага сямейнага жыцця», а таму не можа разглядацца як злачынства. Дарэчы, з касацыйнай заявай аб адмене прысуду звярнулася сама збітая жонка.

40 тысяч долараў за сукенку Скарлет

Аматары кіно патрацілі 317 тыс. долараў на апошнім аукцыёне памятных рэчаў у Галівудзе.

Самымі дарагім «сувенірам» стала сукенка, у якой Віўен Лі выконвала ролю Скарлет О'Хары ў самым славутым амерыканскім фільме «Панесеныя ветрам». Ананімны прыхільнік таленту галівудскай зоркі заплаціў за пашытую 60 гадоў назад сукенку 40.250 долараў.

Казіно для туркаў забаронена

Урад Турцыі забараніў грамадзянам краіны наведваць казіно.

Адпаведны закон быў апублікаваны на мінулым тыдні. У афіцыйным каментарыі адзначаецца, што гэтая мера павінна «ўмацаваць грамадскі парадак і асноўныя маральныя прынцыпы». Так што цяпер азартныя гульні ў Турцыі дазволеныя толькі турыстам і... асобам без грамадзянства, якіх толькі ў Стамбуле жыве каля 50 тысяч чалавек.

Шаленства кароў: пытанні застаюцца

Эпідэмія шаленства кароў ідзе на спад і скончыцца яшчэ ў гэтым стагоддзі, сцвярджае брытанскі часопіс *Nature*.

Пачынаючы з 1994 г. фіксуецца штораз менш выпадкаў заражэння кароў на пашы. Хвароба часам перадаецца цялятам з малаком матак, але і гэтыя выпадкі вельмі рэдкія. Магчыма, у кароў выпрацаваўся і генетычна замацаваўся імунітэт. Аднак дагэтуль дакладна невядома, ці мяса хворых жывёл можа стаць крыніцай інфекцыі для людзей. Калі так, то нас чакае трагедыя не меншая, чым СНІД, лічаць брытанскія эксперты. За апошнія 15 гадоў — ад часу, калі ў Вялікабрытаніі распачалася эпідэмія, людзі з'елі больш за 700 тыс. штук заражанай жывёлы. Пры гэтым значна больш рызыкуюць тыя, хто есць сасіскі і гамбургеры, чым аматары смажанага мяса. Колькасць брытанцаў, у якіх можа развіцца смяротная хвароба Кройцфельдта-Якаба *(CJD)*, ацэньваецца ў 2 млн. чалавек.

Асаблівую занепакоенасць медыкаў выклікае факт, што ў апошні час *CJD* набывае злаякасную, бліскавічную форму. Раней хвароба развівалася паступова і зводзіла ў магілу асоб старэйшага веку. Аднак за апошнія два гады ў Брытаніі ад яе памерла 12 маладых людзей.

Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by Internet: http:\\www.gis.minsk.by © СВАБОДА Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 46.400
Нумар падпісаны ў друк 30.09.96 (15.00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 215 Заказ 2617

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010